# «Гарэцкія — нацыянальны брэнд Беларусі»

***13 снежня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адсвяткавалі 90-годдзе акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і грамадскага дзеяча Радзіма Гарэцкага. Сустрэча пад назвай «Апантаны Бацькаўшчынай» стала адным з шэрагу мерапрыемстваў, што ладзіць грамадская арганізацыя «Беларускі фонд культуры» ў межах праекта «Мой род – мая радзіма». Варта дадаць, што Радзім Гаўрылавіч з першых дзён існавання Беларускага фонду культуры і па сёння – нязменны член рады грамадскай арганізацыі, уладальнік ганаровага знака БФК «Руплівцу. Стваральніку».***



Галіна і Радзім Гарэцкія

Вядоўца імпрэзы намеснік старшыні БФК Анатоль Бутэвіч найперш распавёў пра цыкл сустрэчаў «Мой род – мая радзіма», якія ладзіліся з удзелам краязнаўцаў з розных куткоў Беларусі. Своеасаблівым працягам стаў конкурс «Славутыя імёны маёй малой радзімы», аб'яўлены «Краязнаўчай газетай» сумесна з газетай «Звязда», які доўжыцца дагэтуль.

– Род Гарэцкіх – гэта гонар і годнасць нашай радзімы, і з яго гісторыі ў тым ліку складаецца гісторыя сучаснай Беларусі, – распавёў А. Бутэвіч. – Род Гарэцкіх сведчыць пра вынослівасць, цярплівасць, здольнасць пераадольваць нягоды.

Як вядома, у пачатку 1930-х гадоў Гаўрыла Гарэцкі з сям'ёю быў высланы з Беларусі ў Карэлію, пазней працаваў геолагам у розных рэгіёнах Расіі. Быў рэабілітаваны ў 1958 годзе, але дазвол вярнуцца ў Беларусь атрымаў толькі ў 1968 годзе, калі яму было ўжо амаль 70.

– Гэты род, шмат перажыўшы, застаўся верным сваёй абранай дарозе, – заўважыў Анатоль Іванавіч. – У Радзіма Гарэцкага быў доўгі шлях да Беларусі. Ён мог застацца ў Маскве і быць навукоўцам, але бацькоўскія карані паклікалі яго на радзіму, якую ён уславіў сваімі навуковымі дасягненнямі і ўслаўляе цяпер. Бо ці шмат знойдзецца людзей такога паважнага веку, якія працуюць – і працуюць не проста дома ў сваім кабінеце, а на навуковай пасадзе?

Дарэчы, 5 снежня адзначыла дзень нараджэння жонка Р. Гарэцкага Галіна Рыгораўна. З нагоды двайнога юбілею старшыня Беларускага фонду культуры Тадэуш Стружэцкі ўручыў сужэнцам створаную майстрыхай Лізаветай Чырвонцавай выцінанку «Разам да зораў». На ёй разам ляцяць да зораў два Стральцы – пад гэтым знакам задыяка нарадзіліся муж і жонка Гарэцкія.

– Радзім Гарэцкі ўжо ўвайшоў у гісторыю Беларусі, і, напэўна, гэта самая вялікая адзнака яго дзейнасці, – заўважыў Т. Стружэцкі.

Галоўны рэдактар «Краязнаўчай газеты» Уладзімір Гілеп павіншаваў юбіляраў уласным вершам – на першыя ў яго жыцці паэтычныя радкі Уладзіміра Аляксандравіча натхнілі юбілеі «стральцоў» Радзіма Гаўрылавіча і Галіны Рыгораўны:

*Калі ўжо цэліць,*
*то страляць,*
*Вялікай Мэты*
*дасягаць!* –

пажадаў Уладзімір Аляксандравіч.

Пад час сустрэчы Радзім Гарэцкі дзяліўся ўспамінамі пра сваё дзяцінства і старэйшыя гады, пра бацьку і вяртанне ў Беларусь. Цікавая згадка засталася ў яго пра Якуба Коласа, з якім сябраваў бацька:

– Памятаю, як да нас у госці прыходзіў Якуб Колас. Яго прыход для мяне заўсёды быў радасцю, таму што ён абавязкова прыносіў мне цукерку. Да гэтага я каштаваў толькі падушачкі, самыя даступныя на той час цукеркі, а ён прыносіў шакаладную, нейкага «Мішку...». Памятаю, як я думаў: калі ж да нас зноў прыйдзе дзядзька Якуб?

– Дзень нараджэння Радзіма Гарэцкага – нацыянальнае свята, – упэўнены старшыня Беларускага саюзу мастакоў Рыгор Сітніца, – няхай сабе нацыя гэтага і не ўсведамляе. Таму што Гарэцкія, як Белавежская пушча, як возера Нарач, як Францыск Скарына, – гэта нацыянальныя брэнды, на якіх, уласна, і трымаецца нацыя, і якія сведчаць, што нацыя не пахіснецца.

*Ніна КАЗЛЕНЯ*
*Фота Наталі КУПРЭВІЧ*

### *«Стральцам» – Галіне і Радзіму*

Лыжня,
даўным-даўно
пракладзеная вамі,
жыццёвым шляхам
вашым стала разам.

Шляхам важкім,
не простым,
можа, нават цяжкім,
паўнюткім творчых
адарэнняў,
любові, славы і сумлення.

Мы з БФК
жадаем вам –
ад Бога і Бацькоў –
«стральцам»:
калі ўжо цэліць,
то страляць,
Вялікай Мэты
дасягаць!

*Уладзімір ГІЛЕП*
*13 снежня 2018 г.*



Першы намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алена Даўгаполава з юбілярам



Уладзімір Гілеп і Тадэуш Стружэцкі

